# Раздзел VII

# МЕДЫЯКУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРНА- МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА

## НОВАЕ ТВОРЧАЕ ПЕРААСЭНСАВАННЕ ТРАДЫЦЫЙ НАРОДНАГА І ІНСІТНАГА МАСТАЦТВА (дасведчаны арт-журналіст між мінулым і будучыняй)

***Г. Б. Багданава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*galina bagdanava@mail.ru*

Аўтар разглядае, як традыцыі народнага і інсітнага мастацтва вобразна пераасэнсоўваюцца сучаснымі прафесійнымі мастакамі. Акрэслівае, як арт-журналіст мусіць суадносіць сучасныя творы з традыцыямі.

***Ключавыя словы:*** народнае мастацтва; інсітнае мастацтва; мастак; традыцыі; сучасныя творы.

## A NEW CREATIVE REINTERPRETATION OF THE TRADITIONS OF FOLK AND INSIT ART (an experienced art journalist between the past and the futur)

***G. B. Bagdanava***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: G. B. Bagdanava (galina bagdanava@mail.ru)*

The author examines how the traditions of folk and insit art are figuratively reinterpreted by modern professional artists. He outlines how an art journalist should relate contemporary works to traditions.

***Key word:*** folk art; Insite art; artist; traditions; contemporary works.

Дваццатае стагоддзе дазволіла мастацтвазнаўцам не толькі зафіксаваць, сістэматызаваць, але і разам з арт-журналістамі давесці шырокаму колу чытачоў, слухачоў, гледачоў унікальную каштоўнасць як традыцыйнага народнага, так і інсітнага мастацтва. Калі мы прааналізуем публікацыі ў такіх часопісах, як «Декоративно-прикладное искусство СССР», «Мастацтва», газетах «Культура», «Літаратура і мастацтва», «Мінская праўда», «Звязда» і іншых (у большасці саюзных рэспублік выходзілі асобныя часопісы «Народнае мастацтва»), мы ўбачым шмат публікацый і пра асобныя творы, і пра саміх народных майстроў. Калектыўная традыцыя, якая зберагалася ў кожным рэгіёне, мае ў сабе той карэнны імпульс, які дапамагае кожнаму творчаму чалавеку, прафесіяналу, абапіраючыся на традыцыю, рабіць новыя творчыя адкрыцці.

І на Беларусі, і практычна ва ўсіх цывілізаваных краінах сёння мастакі-прафесіяналы вельмі па-сучаснаму пераасэнсоўваюць пластыку, асобныя элементы традыцыйных вырабаў. І арт-журналісты мусяць пастаянна вяртацца да мінулага. Гэта дазволіць кожнаму зразумець глыбінны падтэкст нават абстрактных кампазіцый. Нават арнаментальныя выявы на беларускіх манетах маюць канкрэтнае значэнне. Пра гэта, на шчасце, пісалі беларускія газеты і часопісы. На аснове народных традыцый ствараюць свае запатрабаваныя ў самых сучасных інтэр'ерах творы кераміст Тамара Васюк і яе вучні. І арт-журналіст мае магчымасць праз інтэрв'ю дакрануцца да глыбіняў нашых традыцый і гісторыі. Тое ж тычыцца і тканых вырабаў, вырабаў з дрэва і г. д. Такім чынам, з аднаго боку, варта вяртацца да зафіксаваных у інтэрв'ю філасофскіх разваг народных майстроў. З другога – да каментарыяў і тлумачэнняў тых, хто па-новаму пераасэнсоўвае народныя традыцыі. А таксама да мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў мастацтва. Гэта вельмі аздобіць як рэспубліканскія, так і раённыя, рэгіянальныя выданні. Важна захаваць мову народных майстроў. Гэта дасць магчымасць адчуць і супаставіць, напрыклад, рытміку краявіду, рытміку мясцовага маўлення, рытміку арнаменту і г. д.

Што тычыцца такой з'явы, як інсітнае мастацтва, то сёння прафесійныя мастакі часта выкарыстоўваюць сістэму прымітыву для ўвасаблення сучасных сюжэтаў. Так, на Міжнароднай мастацкай выстаўцы 2020 года ў Парыжы было дастаткова шмат мастакоў з розных еўрапейскіх краін, якія экспанавалі творы ў стылі інсітнага мастацтва.

«Прымітывізм, наіўнае (інсітнае) мастацтва – плынь у выяўленчым мастацтве канца XIX – пачатку XX ст., прадстаўнікі якога спрашчаюць мастацкія сродкі і вобразы. Самымі яркімі прадстаўнікамі прымі-

тывізму былі А. Русо, К. Бамбуа – Францыя, Н. Пірасманашвілі – Грузія, І. Генераліч – Харватыя і інш.» [1, с. 468].

У XX стагоддзі гэта былі як правіла мастакі, якія не мелі спецыяльнай мастацкай адукацыі. Але іх вобразнае бачанне было настолькі моцным, што нават, здавалася б, прымітыўна напісаныя або выразаныя з дрэва творы мелі наймацнейшае ўздзеянне. За савецкім часам існаваў яшчэ адзін тэрмін – «самадзейнае мастацтва». Але самадзейныя мастакі імкнуліся набыць прафесіналізм у студыях, на курсах, завочна ў інстытутах, імкнуліся пісаць, як Шышкін, Левітан… Арт-журналіст сёння мусіць арыентавацца ў інсітным мастацтве, адрозніваць шчырыя творы ад падробак, якія часцей з’яўляюцца кічам. І тут варта звяртацца да нашых выдатных мастацтвазнаўцаў Л. Вакар, Р. Шауры і інш. Класікай беларускага інсітнага мастацтва сталі творы Алены Кіш, Васіля Жарнасека, Міколы Тарасюка і іншых. Арт-журналісты ведаюць, што ў інсітных мастакоў ёсць арыгінальны не толькі мастацкі, але і жыццёвы погляд на свет. Таму ў матэрыялы лепш уключаць іх маналогі, каментарыі да ўласных твораў. Гэта пацвярджаюць дакументальныя фільмы пра М. Тарасюка, І. Супрунчыка і іншых.

Такім чынам, сёння, у XXI стагоддзі, калі тэлебачанне, кіно, інтэрнэт маюць магчымасць візуалізаваць героя і ягоныя творы, агучыць наяве ягоную мову, у друкаваных выданняў застаецца магчымасць хаця б раз на тыдзень прадстаўляць народнага майстра або інсітнага мастака, ягоныя творы, ягоны лад мыслення, што, несумненна, не толькі разнастаіць выданне, але і дапаможа кожнаму вызначыць сваю самасць, не саромецца сваёй індывідуальнасці. І тут дасведчаны арт-журналіст здолее шмат зрабіць і для сваіх герояў, і для чытачоў, сярод якіх нямала мастакоў.

Яшчэ адзін ход – прэзентацыя на старонках выдання пэўнага рэгіёна, што ў свой час рабілі газета «Культура» і часопіс «Мастацтва». У такім выпадку пра гісторыю традыцый могуць давесці даследчыкі або супрацоўнікі рэгіянальнага музея, пра сённяшні дзень – мясцовыя работнікі культуры і самі людзі. Нават невялікія інтэрв’ю, выразныя фотаздымкі дадуць уяўленне пра сённяшні і заўтрашні дзень традыцый.

Можна з нумара ў нумар знаёміць з рэдкімі музейнымі экспанатамі, работамі тых, хто пераймае традыцыі ў Доме рамёстваў.

У наш час уніфікацыі толькі культура, творчасць дапамагаюць чалавеку вызначыць і захаваць сваю індывідуальнасць.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Сахута Я. М.* Сучаснае народнае мастацтва Беларусі: манаграфія. Мінск : Беларусь, 2015. 300 с.